## Даль

Зацвіла прыгожая ліпа.

Колькі шуму было тут на гэты час, колькі рознагалосага спеву! Працавітыя пчолкі, усялякія мушкі гулі так, што здавалася, нібы ліпа – гэта нейкі дзіўны музыкальны інструмент і тут адбываецца ігрышча. Але адцвіла ліпа, пачало спець насенне. Расло адно зярнятка на самай высокай галінцы. Можа, гэтая высачыня і была прычынаю таго, што маладому насенню захацелася кінуць тутэйшы грунт і перабрацца ў сінюю даль. І якое павінна быць шчасце жыць там, калі ад аднаго толькі погляду на прыволле гэтай далі рабілася светла і радасна на душы.

Бывала, ледзь толькі ўзыдзе сонца, ледзь рассцелюцца на версе лясоў і ўзгоркаў яго залатыя абрусы, як гэтае зерне ўжо не зводзіць вачэй з сіняй далі. Што было ў ёй такога, чым прывабіла яна, гэтая даль, маладое ліпавае дзіця?.. У той бок, адкуль найлепш выглядала гэтая даль, беглі разлогі шырокіх палёў, а на іх межах то там, то сям параскідаліся, як маладзіцы ў жніво, дзікія грушы. Ціхія ўзгоркі, бы хвалі рачныя, таксама, відаць, цягнуліся да няяснай і прыгожай далі. А там, дзе поле ўпіралася ў цёмную сцяну баравога лесу, на самай граніцы, ззяла, як люстэрка, пакручастая стужка вады. Яшчэ далей, там, куды беглі срэбныя загібы бліскучай рэчкі і памыкаліся ўзгоркі, баравы лес і шырокае поле, ужо нельга было разглядзець нічога паасобку – была проста даль, якая так моцна парывае да сябе душу, – даль.

– Эх, – уздыхала маладое зерне, – паляцець бы ў гэтую даль.

Пачуў вецер тыя ўздыханні, устаў з-за ўзгорка, пазяхнуў пасля салодкага супачынку і падляцеў да маладога насення.

– А я і ведаў, – сказаў ён, – што не сягоння-заўтра папросішся ты ў дарогу. Трэба, трэба пазнаваць Божы свет!

І стала прасіць маладое насенне, каб вецер узяў яго з сабою і панёс у аблюбаваную даль.

Старой ліпе шкада было пускаць дзіця ў чужы свет, Бог знае куды, але што парадзіць? Можа, там будзе і лепей яму? Дык што станавіцца ўпоперак дарогі? Мо гэты шлях – шлях яго шчасця? Благаславіла маці сваё дзіця:

– Ляці, мілае!

Падхапіў вецер маладое насенне і панёс. Лятуць яны, і здаецца, самі бягуць на спатканне прыгожыя ўзгоркі, зялёныя лагчынкі. Пазірае на ўсё маладое насенне і вачам сваім не верыць: няўжо гэта тыя самыя малюнкі, на якія глядзела яно так нядаўна? А дзе ж іх хараство? Дзе тыя абрысы, дзе грабяні, што так павабна выглядалі адтуль – з ліпы? А палоскі лясоў? Нават сама рэчка не такая, якою здавалася здалёк.

Нейкі неспакой пачынаў агортваць маладое насенне. Ой, ці не жартуе з ім вецер: ці туды нясе ён, куды прасілася душа?

– А ці скора будзе тая даль, мілы вецер?

– Мы даўно мінулі яе, – адказаў вецер, – а цяпер новая даль перад намі.

*Паводле Якуба Коласа*
*1917*